# Верны сын народа

Глыбокая ноч. У невялікім пакоі цьмяна гарыць капцілка. З-за стала падымаецца высокі, смуглявы чалавек.

— Сябры! З гэтага дня мы—байцы. Другога выбару няма. Лепш загінуць у барацьбе, чым жыць пад ярмом чужынцаў,—гаворыць ён.—Сёння-ж бярэмся за зброю. Пастаім за зямлю нашу родную, за народ!

Гэта было зімой 1942 года. У кватэры настаўніка Пятра Міронавіча Машэрава адбыўся сход Расонскай падпольнай комсамольскай арганізацыі. Сход аднагалосна прыняў пастанову: пачаць адкрытую партызанскую барацьбу з ворагам, усім членам падпольнай комсамольскай арганізацыі рашна ўступіць у рады народных мсціўцаў. Камандзірам партызанскага атрада комсамольцы аднадушна выбралі Пятра Машэрава, а яго намеснікам—Сяргея Пятроўскага. Атраду было прысвоена імя легендарнага палкаводца Шчорса.

Хутка па Расоншчыне разнеслася вестка аб дзеяннях партызан. Пад камандаваннем Пятра Машэрава была зроблена засада на бальшаку Расоны-Клясціцы. У паветра ўзляцела варожая аўтамашына. Шчорсаўцы забілі капітана гестапа і трох афіцэраў. Так пачалося баявое жыццё патрыётаў.

... Ціхая жнівеньская ноч. Туман згусціўся над зямлёй. Атрад Пятра Машэрава па лясных сцежках прасоўваўся да ўмацаванага нямецкага гарнізона. Штурмуючыя, дыверсійныя і атакуючыя групы партызан выйшлі на зыходны рубеж.

Пётр са сваёй групай хутка прасоўваўся ўздоўж палатна чыгункі, да маста.

цы Дрыса быў узарваны чыгуначны мост працягласцю ў 96 метраў. На два тыдні быў спынен рух варожых цягнікоў.

Многа баявых аперацый правёў смелы камандзір. У завею і сцюжу партызаны-лыжнікі паяўляліся там, дзе іх не чакаў вораг, і наносілі адчувальныя ўдары па нямецкіх гарнізонах. На рахунку атрада імя Шчорса—сотні забітых фашыстаў, дзесяткі ўзарваных аўтамашын, мастоў, пушчаных пад адкос цягнікоў.



Кажуць, што чалавек пазнаецца ў працы і быце, а на фронце—у баі. І гэта праўда. У небяспечнай абстаноўцы Пётр трымае сябе разважліва і спакойна, у баі ён смелы і знаходлівы. Ён заўсёды праяўляў выключныя клопаты аб байцах. За гэта яго любілі і паважалі партызаны.

Часам Пётр успамінаў родную вёску Шыркі на Багушэўшчыне. Там ён нарадзіўся, там прайшло яго дзяцінства. Там-жа ў 1934 годзе ён скончыў сямігодку, а ў 1935 годзе—Віцебскі п[illegible]рабфак

ваў настаўнікам у Расонскай сярэдняй школе. Педагагічная праца стала для яго любімай справай.

І раптам вайна. Нямецкія фашысты ўварваліся ў Расоны.

Два разы спрабаваў Пётр перайсці лінію фронта, каб стаць у рады воінаў і да апошняй кроплі крыві абараняць дарагую маці-Радзіму. Але абедзве спробы вырвацца да сваіх цярпелі няўдачу. І калі апошні раз, здавалася, яшчэ крок—і ён пераступіць франтавы рубеж, яго схапілі фашысты, кінулі ў таварны цягнік, які ішоў у праклятую Нямеччыну. Толькі смелы пабег выратаваў Пятра ад фашысцкай катаргі.

* * *

У жніўні 1943 года партыя накіравала тав. Машэрава на пасаду сакратара Вілейскага падпольнага абкома ЛКСМ Беларусі. Ён усёй душой аддаўся рабоце з моладдзю. Днём і ноччу Пётр расказваў юнакам і дзяўчатам аб баявых справах народных мсціўцаў, аб жыцці совецкіх людзей на Вялікай зямлі, аб набліжэнні радаснага дня вызвалення. Моладзь ішла за ім. Звыш 3-500 юнакоў і дзяўчат Вілейшчыны ўступілі ў рады народных мсціўцаў.

Совецкі ўрад высока ацаніў баявыя заслугі Пятра Машэрава, прысвоіўшы яму званне Героя Совецкага Саюза.

Пасля вызвалення Беларусі ад нямецкіх акупантаў тав. Машэраў на працягу двух з паловай год працуе сакратаром Маладзечанскага абкома ЛКСМ Беларусі. У мірных умовах, як і ў гады вайны, Пётр Міронавіч свята выконвае давер'е бальшавіцкай партыі.

IX пленум ЦК ЛКСМ Беларусі

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы